Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 20 (608) Пятніца, 18 чэрвеня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

ПРЫВІТАННЕ З АЛЖЫРА

ПІШУЦЬ ВАМ З ДАЛЁКАГА АЛЖЫРА ПАСЛАНЦЫ ЎНІВЕРСІТЭТА—СТУДЭНТЫ ЛАДЫСЕЎ І БУБНОЎ...

Раніцай мы прыехалі ў раён Кабіліі—адзін з самых прыгажэйшых і цудоўнейшых куткоў Алжыра. Тут было ўжо шмат «домікаў»—цэлы гарадок, да іх далучыўся і наш. Зрабілі мы яго хутка: нацягнулі палатку—і ўся работа па будаўніцтву «дома». Але ён атрымаўся ў нас на славу. Акружаюць наш «горад» высокія горы—на іх яшчэ ляжыць снег, хоць тэмпература ў нашым палатачным доміку даходзіць днём да 50 градусаў.

Маладзёжны атрад СССР, у склад якога мы ўваходзім, будуе вёску, для жыхароў Кабіліі. У гэтай вёсцы будзе арганізаваны каператыў. Працаваць пачалі трэцяга мая і за гэты рабочы перыяд наш атрад за выдатную работу атрымаў пераходны сцяг ЦК ВЛКСМ.

Дамы будуем двухпавярховыя. Работы шмат. Таму працуем па дзевяць гадзін у суткі. Працуем дружна, старанна—ўба хутчэй даць людзям жыллё...

Побач з намі працуюць Алжырскія валанцёры, сябры з Балгарыі і Германскай Дэмакратычнай рэспублікі. Чакаем прыезду будаўнікоў з братняй Польшчы, Чэхаславакіі, Італіі, Францыі і іншых краін свету.

Алжырскія валанцёры — гэта хлопцы ва ўзросце 16—19 год. Яны прыехалі сюды з розных куткоў Алжыра, каб прыняць удзел у будаўніцтве. Акрамя работы яны вучацца — трэба набыць спецыяльнасць будаўніка. Мы стараемся вучыць іх усяму таму, што можам самі.

А як цікава мы праводзім вольны ад работы час?!

Наш лагер зрабіўся арэнай «міжнародных сустрэч» па футболу, валейболу, баскетболу. «Міжнародныя сустрэчы» праводзім амаль кожны дзень. Калі прысутнічаеш на іх, забываешся на стому ў плячах, забываешся, як ныюць рукі і ногі. Часам здаецца, што тут сабраліся людзі нейкай цудоўнай краіны, якая яшчэ не мае назвы, і гэтыя людзі жывуць дружнай, адзінай сям'ёй.

Наш атрад уключаны ў састаў Савецкай дэлегацыі, якая будзе прымаць удзел у Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў.

Перадаём нашы будаўнічае прывітанне студэнтам універсітэта.

ЛАДЫСЕЎ, БУБНОЎ.

МАРШРУТЫ СТУДЭНЦКАГА ЛЕТА

Набліжаецца доўгачаканая пара летніх канікул. Пара радасці, адпачынку і весялосці. Якія ж шляхі-дарогі адкрывае лета 1965 года перад падарожнікамі нашага універсітэта? Адказаць на гэтае пытанне мы папрасілі старшыню спартыўнага клуба М. Шэйнэмана.

— З кожным годам у нашым універсітэце павялічваецца колькасць аматараў турызма, — сказаў М. Шэйнэман. — Чыстае, вільготнае паветра, пачоўкі ля азёр і мора, пераходы праз перавалы і горы даюць усе магчымасці добра адпачыць, умацаваць сваё здароўе.

— Дзе правядуць канікулы нашы студэнты?

— Больш чатырохсот выедзе ў спартыўна-аздараўленчы лагер па возера Нарач. А аматары і раманцікі далёкіх падарожжаў — 50 спартсменаў-турыстаў нашага універсітэта пойдуць у паход па дарогах Прыморскага Краю, Карэліі, Карпат, Каўказа. Больш васьмісот студэнтаў пажадалі ўдзельнічаць у турысцкіх падарожжах у Гарадзішчы, Ратомку, Радашковічы, па Мінскае водасховішча.

— А ці будуць пуцёўкі ў санаторыі?

— Больш сотні студэнтаў накіруецца ў дамы адпачынку, санаторыі Беларусі і Паўднёвага пабярэжжа Чорнага мора. Шэсцьдзесят савецкіх і замежных студэнтаў выедуць у спартыўна-аздараўленчы лагер Кіеўскага універсітэта на правабярэжжа Дняпра.

— Нам цікава таксама даведацца, калі будзе адпраўлена першая група студэнтаў у падарожжа?

— Ужо восьмага ліпеня з дзесяцідзённым падарожжам з Мінска накіруецца аўтапоезд «Дружба», у якім сто дваццаць студэнтаў універсітэта пазнаёміцца з многімі цудоўнымі куткамі нашай роднай Беларусі. Пасля яго адправіцца яшчэ некалькі эшалонаў, 68 студэнтаў — турыстаў накіруецца ў васьмісутачны паход па Мінскай вобласці, каб атрымаць трэці разрад турыста...

— Як бачыце, — сказаў М. Шэйнэман у заключэнне, — з кожным годам пашыраецца геаграфія маршрутаў і зон лагернага адпачынку студэнтаў універсітэта.

Шчаслівай дарогі вам, сябры!

В. МУХАЕЎ.



НА ЗДЫМКУ: ідуць экзамены. Выкладчык Ул. В. БАБКОЎ уважліва слухае адказ студэнткі Г. ДУБНЕЎСКАЙ па вылічальнай матэматыцы.

ІДЗЕ СЕСІЯ

Экзамены на гістарычным

Дошка аб'яў дэканата гістарычнага факультэта. На ёй, акрамя звестак і аб'яў—змешчаны цяпер курсавыя экзаменацыйныя ведамасці, дзе адлюстроўваецца ход сесіі. Вось графа «Гісторыя БССР — 1 курс». Раніцай яна яшчэ была пустой. А зараз — адзнакі. Выкладчык Аляксандр Пятровіч Ігнаценка глядзіць на іх і радуецца: большасць пастаўленых ім адзнак—«выдатна» і «добра». Прыпамінаецца зімняя экзаменацыйная сесія. Тады ў Аляксандра Пятровіча не было такога задавальнення. Не ўсе адказы студэнтаў па гісторыі БССР былі задавальняючымі. А цяпер адчуваецца, што веды студэнтаў па гэтаму прадмету значна выраслі, палепшылася якасць падрыхтоўкі. І гэта не магло не сказацца на выніках экзамена. З дваццаці аднаго студэнта групы ніхто не атрымаў «тройкі». Асабліва глыбокія веды на экзамене паказалі першакурснікі Л. Шчэрбачэня, М. Аўсіевіч, А. Аляксеенка. Гэтыя студэнты заўсёды актыўна выступалі на семінарскіх занятках, уважліва слухалі лекцыі, чыталі многа літаратуры.

«Група цаліннікаў»—так запісана ў другой экзаменацыйнай ведамасці. Тут штодзённа запісваліся вынікі экзаменаў тых, хто паехаў на цалінныя будоўлі краіны...

Экзамены па педагогіцы здавалі студэнты-цаліннікі другога курса. Не лёгкі білет папаўся студэнту гэтага курса Анатолю Пугоўка. Каб адказаць на яго студэнту мала было даць агульную характарыстыку прынцыпаў і правіл дзідактыкі. Сцяпан Андрэевіч Умрэйка, які прымаў экзамен, хацеў, каб студэнт асабліва спыніўся на прыкладах работы савецкай школы. Анатоль спачатку хваляваўся, а пасля адказ на білет стаў спакойным і ўпэўненым—студэнт добра падрыхтаваўся да гэтага экзамена. На дадатковыя пытанні таксама даў глыбокія адказы... Праз некалькі хвілін у яго заліковай кніжцы красавалася адзнака «выдатна». Іх у Анатоля многа. Дакладней адны яны. Анатоль — «выдатнік». Ён студэнт другога курса. Гэта яго чацвертая сесія.

У гэтым годзе ў студэнтаў гістарычнага факультэта згодна новай праграмы няма экзамена па гісторыі новага часу. Замест яго залік. Выкладчык, прафесар Мікалай Паўлавіч Палеціка, для праверкі ведаў студэнтаў па гісторыі новага часу выбраў форму «калёквіума». Два з іх ужо адбылося, а ў гэтыя дні заканчацца і апошнія.

Сесія на гістарычным хутка закончыцца. Засталося здаць лічаныя экзамены. І ўжо цяпер можна сказаць, што вынікі экзаменаў на гістарычным будуць значна лепшымі, чым у зімовую сессію.

Я. БАРАНОЎСКІ,
студэнт 4-га курса гістарычнага факультэта.

ТАК ТРЫМАЦЬ, ДЗІНА!

Я часта бачу гэтую дзяўчыну. Бачу, як яна ідзе на лекцыі. Уся такая сабраная, стрыманая і акуратная. Яна—другакурсніца вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта.

Бачу яе і на заводзе. Тут яна такая ж акуратная і стрыманая. Працуе Дзіна Кузьміна на электратэхнічным заводзе ў аддзеле тэхнічнага кантролю.

Майстар цэха Трышкін расказвае:

— Дзіна адна з лепшых нашых працаўніц, яна мае высокі разрад кантралёра, старанна выконвае любые даручэнні дырэкцыі. Яна ўдарніца камуністычнай працы. Дзіна адна з тых, пра якую на заводзе гавораць: «Працалюбівая і старанная дзяўчына». Яна ніколі не лічыцца з асабістым часам, калі трэба, застанецца і пасля змены, не скончыўшы задання, ніколі не пойдзе з цэха...

— Ці прымае яна ўдзел у грамадскай рабоце завода?—пытаюся я ў майстра.

— Дзіна любіць рабочы калектыў, яна добры таварыш, не прайшло ніводнага нядзельніка ці суботніка, на якім бы не прысутнічала Дзіна. Добрая яна дзяўчына, нічога не скажаш,—гаворыць у заключэнне Трышкін.

І гэта не дзіўна. Добра працуючы на вытворчасці, Дзіна Кузьміна старанна ставіцца і да вучобы.

Я сустрэўся з старастам групы Мішам Гаманчуком і папрасіў яго расказаць пра Дзіну як студэнтку нашага універсітэта.

— Апошнюю сесію яна здала на «выдатна». Да гэтай таксама добра падрыхтавалася, часта выступала на семінарскіх занятках, многа прачытала вучэбнай літаратуры. Яна заўсёды рада дапамагчы таварышам, і таму яе мы ўсе вельмі паважаем,—гаворыць Міша і дадае,—акрамя гэтага яна актыўна ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці універсітэцкага калектыва.

Поспехаў табе, Дзіна ў працы, вучобе і жыцці.

М. ВЯРШЫНІН,
студэнт першага курса вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта.

КОЖНЫ БІЛЕТ ШЧАСЛІВЫ

Добрымі ведамі зарэкамендавалі сябе студэнты другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Нядаўна яны здавалі экзамен па «дыялектычнаму матэрыялізму».

Хваляваліся многа. А калі здалі і падвялі вынікі — аказалася, што ў першай групе адзнакі «добра» і «выдатна». Ніводнай «здавальняючай»!

«Выдатна» атрымаў на экзамене наш камсамольскі важак Пеця Нікуленка, староста групы Васіль Кошман, а таксама студэнткі Марыя Кажэмяка, Ларыса Гусак, Галя Шмыгіна, Іра Юрчык і многія іншыя.

Я запыталася ў выкладчыка В. Лапцёнка, якое яго меркаванне аб групе?

— На працягу ўсяго выкладання «дыялектычнага матэрыялізма» я не зрабіў ніводнай заўвагі студэнтам ні ў час лекцый, ні ў час семінарскіх заняткаў. Такі вынік экзамена не выпадковы. Група вельмі старанная і дысцыплінаваная. Я вельмі задаволены ёй...

В. МЕЛЕЖ,
студэнтка трэцяга курса.



Цікавы стэнд **«Ул. І. Ленін і партыя»** аформіла кафедра і кабінет гісторыі КПСС.

НОВАЯ СТАРОНКА АФРЫКІ

Афрыка адкрывае новую старонку ў сваёй гісторыі. Над землямі 36 афрыканскіх дзяржаў зазняла сонца свабоды. Афрыканскія рабочыя і сяляне пачалі будаваць новае жыццё. Маё сэрца поўна радасці за тое, што савецкі народ дапамагае нам, афрыканцам, у барацьбе з каланізатарамі. Каланізатары ніяк не могуць звыкнуцца з думкай, што багатыя землі афрыканскага кантынента назаўсёды згублены для іх. Яны спрабуюць пад рознымі выглядамі «дапамогі» зноў закабаліць наш народ, але мы ім смела гаворым: «Янкі, прэч!». Для нас, сведак страшэнных год каланіяльнага іга, вядомы звярыныя законы імперыялістаў. І ім не павінна быць месца на зямлі Афрыкі. Доўгі крававы шлях вызваленчай барацьбы навучыў нас многаму. Ён паказаў крыніцу нашай сілы ў справядлівай барацьбе — саюз усіх прыгнечаных. Таму мы цяпер з асаблівай цяплынёй ўспамінаем рашэнні канферэнцыі ў Адыс Абебе, якая заклікала да аб'яднання ўсіх прагрэсіўных сіл у барацьбе супраць імперыялістаў.

Свабоду народам афрыканскага кантынента! Афрыканская зямля павінна быць свабоднай! Гэты лозунг быў і застаецца ў праграме нашай барацьбы, таму што яшчэ ёсць на кантыненце народы, дзе пануюць імперыялісты. Але мы верым, што прыйдзе час, калі і гэтыя народы скінуць цяжкае ярмо прыгнёту.

Афрыканскі кантынент адкрывае новую старонку ў сваім жыцці. Яна будзе поўна працоўных поспехаў, пчасця і радасці чалавека. Вядома, усё гэта не прыйдзе адразу. Нам прыдзецца пераадолець многа цяжкасцей, перш чым ператварыць наш кантынент развітым у эканамічных адносінах. Цяпер у нас будуецца многа заводаў, фабрык — імі кіруюць свабодныя людзі. Але сярод іх мала яшчэ высокакваліфікаваных спецыялістаў, аб падрыхтоўцы якіх капіталісты не хацелі нават і думаць. Але я веру, што пройдзе зусім кароткі час і на заводы прыйдзе моладзь з дыпломамі вышэйшай і сярэдняй адукацыі. Многія з іх прыедуць з Савецкага Саюза і іншых краін сацыялізма. Яны стануць актыўнымі будаўнікамі новага жыцця на кантыненце. Я веру ў наша новае жыццё, у перамогу сацыялізма на афрыканскім кантыненце. Цяпер нашы дзеці могуць хадзіць у школу, моладзь атрымлівае магчымасць працаваць і вучыцца. Работнікі сельскай гаспадаркі ўпэўнены, што ўраджай іх палёў належыць толькі ім.

Мы вельмі ўдзячны людзям добрай волі ўсіх кантынентаў, за тое, што яны змагаюцца за мір і дружбу паміж народамі.

Дык няхай наша дружба будзе вечнай! Няхай на зямлі заўсёды будзе мір!

В. АЦІЕНА,
студэнт-афрыканец.

БУДНІ СТУДЭНТАЎ-ЖУРНАЛІСТАЎ

Цудоўная пара года—лета! Таму, відаць, многія першакурснікі аддзялення журналістыкі прысвяцілі ёй многа сваіх вершаў. І калі б іх скласці ўсе разам—атрымалася б тоўстая кніжка. Пакуль што ўрыўкі з яе знаходзяцца ў запісных блакнотах першакурснікаў. Бо іх ўся ўвага цяпер накіравана на другое—сесію. Сесія—крокі да сталасці. На працягу яе студэнт паказвае свае веды, усё тое новае, што яму ўдалося даведацца ў аўдыторыі за год вучобы. Прыходзілася працаваць на працягу года многа. Вучоба ўскладнялася яшчэ і тым, што ўся група праходзіла практыку ў шматтыражных газетах. У маі месяцы яна закончылася, да экзамена па «тэорыі і практыцы партыйна-савецкага друку» кожны студэнт прынёс выкладчыку Марку Саламонавічу Зярніцкаму свае матэрыялы. Гартаючы іх можна бачыць усю справаздачу маладога журналіста за практыку, яго імкненне, жанры, над якімі працаваў ён, тэмы і праблемы.

Многа за практыку было выдатных адзнак. Яны радуюць выкладчыка. Яшчэ б, артыкулы першакурснікаў можна пачытаць на старонках многіх рэспубліканскіх і абласных газет. З месца праходжання практыкі добрыя водгукі рэдакцый. Першы курс аддзялення журналістыкі падае добрыя надзеі. Аб гэтым сведчыць і другі экзамен, які зусім нядаўна здалі першакурснікі па «тэхніцы афармлення газеты». Гэта адзін з самых важных практычных прадметаў журналістаў. Навучыцца размяшчаць памер здымка ў газеце, памеры газетных шрыфтоў і іх назвы — складаны працэс. Але студэнты ім авалодалі паспяхова, упартай працай заваявалі права на атрыманне станоўчай адзнакі.

А Фёдар Кулакоў і Анатоль Гарбачоў здалі ўсе пяць экзаменаў на «выдатна».

Паседжанне камітэта камсамола,—сярод лепшых членаў камітэта і наш, цяпер другакурснік, Міша Ціва. У яго было многа камсамольскіх спраў, з усімі спраўляўся паспяхова, гэта не перашкодзіла яму здаць добра сесію. Тое ж можна сказаць і пра студэнта Пятру Пабока. Ён з'яўляецца членам партбюро факультэта.

Усяму таму, што ёсць добрага на курсе студэнты абавязаны сваёй партыйнай арганізацыі. У ёй налічваецца шаснаццаць камуністаў і кандыдатаў. Гэта вялікая сіла! Камуністы сталі завадатарамі ўсіх добрых спраў на аддзяленні. Хто ў групе лепш за ўсіх займаецца? Камуністы. Хто актыўней за ўсіх на семінарскіх занятках і грамадскай рабоце? Зноў камуністы.

Пасля падвядзення вынікаў зімовай сесіі аказалася, што група студэнтаў аддзялення журналістыкі была адной з мацнейшых на факультэце.

Вынікі летняў сесіі паказваюць, што студэнты здалі яе лепш, чым зімовую. Выдатны поспех! Цяпер іх застаецца толькі павіншаваць. Бо яны сябе па праву лічаць ужо другакурснікамі.

Хутка запісныя кніжкі студэнтаў-журналістаў зноў папоўняцца новымі вершамі... аб прайшоўшай сесіі, экзаменах, турысцкіх паходах, адпачынку дома, ці на будоўлях цаліны.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.

ПЕСНІ ШЧЫРАГА СЭРЦА

У сінім небе павольна, нібы заснуўшы ад спякоты, плыве бялёсая хусцінка воблака. З гор і лесу цягне прахалодай. А калі акінеш поглядам далей — бачыш Чорнае мора, яно недзе далёка-далёка зыходзіцца з гарызонтам. Мора кліча, цудоўнай прыгажосцю, заве да сябе лес. Але мы не на Каўказе і не на беразе Чорнага мора... Усё гэта ў маіх думках ад прачытанай кніжкі вершаў Алега Лойкі «Блакітнае азерца». Чытаю я і мне здаецца, што бачу «Тры пальмы», пра якіх паэт піша цёпла і ўлюблёна:

...Ды буду я згадваць заўсёды
Тры пальмы, што выйшлі на
бераг,
Каб іх не звяла непагода,
Каб іх не скрышыла сякера!..

Прыгажосць лета, шматгранасць думкі аб ім, рамантыка далёкіх падарожжаў—такая галоўная тэма першага раздзела кніжкі аўтара «Над кручамі каўказскімі». У ім паэт вядзе свайго героя па прасторах Грузіі, у казачны заапарк, да «Вокнаў, што ў сценах камешных», па прыгожых «Хрыбтах і вяршынях» і ўсюды мы бачым тую замілаваную прыгажосць, пра якую Алег Лойка піша шчыра і задушэўна.

Дакладнымі і яркімі дэталямі паэт усхвалявана малюе вобраз сучасніка, які валіць у тайзе стогадовыя дрэвы, уздымае неабсяжныя палі Казахстана, штурмуе зорныя касмічныя вяршыні.

Адпойчы знаёмы турыст гаварыў мне: «Лепшым правадніком у падарожжы з'яўляецца паэт. Ён заўсёды ўбачыць такое, што мне іншы раз ніколі не заўважыць». Чытаючы вершы зборніка «Блакітнае азерца», я пераконваюся, што турыст меў рацыю.

Алег Лойка ўводзіць нас у цудоўны свет роднай прыроды. Умее адлюстраваць харство тых з'яў і перамен, якія адбыліся ў нашым жыцці. Так напрыклад, пра Леніна ён піша:

...Кажуць, сплывае агонь з
дымам сіне-гаркавым...
Ленін касцёр тут расклаў,
прасвятліўшы прастор,
Аб рэвалюцыі думаў над ім,
аб дзяржаве,—
Зарою світальнай гарыць над
зямлёй той касцёр!..

Асабліва многа вершаў Алег Лойка прысвячае каханню, дружбе і еднанасці народаў СССР, якія разам плячо ў плячо будуюць нашае заўтра. Гэта такія вершы, як «Грузія», «Суперава», «Сіхарулі».

Разнабаковая тэматыка, багаты змест, насычаны цікавымі думкамі,—усё гэта захапляе чытача з першай старонкі і да апошняй.

Ул. ГЕРАСІМАЎ.

НА ПАЭТЫЧНАЙ ПАВЕРЦЫ

Эдуард ЗУБРЫЦКІ.

△ △

Я пакіну вас, вершы, у пакоі
адных
У суседстве з Шэкспірам і
Блокам,
Сам збягу са сцяжын
камяністых, крутых
Там, дзе мора ўзлятала да
самых аблокаў,
Там, дзе мора па гальцы,
гарачай цякло
Непаўторнае ў дзікай сваёй
прыгажосці
І, зялёнага вала ламаючы
шкло,
Было вечна такім, як пісаў
Айвазоўскі.
...Будзе рэха падоўгу між
скалаў блукаць,
І не скора суціхне на гальцы
гарачай...
Я хацеў бы забыць паміж
рыфаў і скал
І трывогі свае, і няўдачы.
Ну, а потым вярнуцца да
вершаў сваіх,
Недапісаных, ціхіх і ранішні
морак
І пайсці разам з імі па
сцежках крутых
У абдымку з грымучым і
ярасным морам.

Мар'ян ДУКСА

Хлопцы

У іх гімнасцёркі вайсковыя
Ці проста кашулі вясковыя...
Як раніца вочы расою
Прамые,
яны з касою,
Бадзёрыя, дужыя хлопцы
Ідуць на спатканне з сонцам.
Лятуць мурагі управа,
Як косы засвішчуць у травах,
І спрытна ў тугія гронкі
Збірае каса рамонкі.
Па ёй, як па сцэне, у сконі
Пускаюцца жвавыя конікі.
Забудуцца хлопцы на клопат,
Падклаўшы пад шчокі копы.
Сасняцца ў копах духмяных
Усмешка і косы каханай.
Развее і сон і мары
Уміг нечаканая хмара.
Дзе возьмецца толькі
рухавасць
І жвавасць!
Не луг—раскапаны мурашнік,
Як схопяцца ўрукапашную
З крывой бліскавіцай
І ліўнем-крыніцай.
А вечарам іх матулі
Выкручваюць ім кашулі.

ШЫМАНСКІ? ХТО ЁН?

Калі я чытаў гістарычную літаратуру Узбекістана, прысвечаную Вялікай Айчыннай вайне, то часта сустракаў прозвішча лётчыка Уладзіміра Аляксандравіча Шыманскага. Некаторыя аўтары называюць яго нацыянальным героем Узбекістана.

Подзвігу гэтага мужнага воіна газета «Правда Востока» 8 верасня прысвяціла вялікі артыкул «Мацней смерці». У ім расказваецца, што Шыманскі ўдзельнічаў у абароне Ленінграда. За час сваіх баявых вылетаў ён знішчыў 200 дальнебойных гармат, 143 аўтамашыны, 77 вагонаў з боепрыпасамі, дзесяткі мастоў, больш чым паўтары тысячы гітлераўцаў.

У адным з баёў Аляксандр Шыманскі расстраляў усе боепрыпасы і ў гэты час на яго напалі варожыя самалёты. Спроба адарвацца ад іх не дала поспеху, тады мужны воін накіраваў сваю машыну на варожыя наземныя цэлі. Пачуўся моцны выбух — і дзесяткі фашысцкіх аўтамашын паляцелі ў паветра. На другі дзень Ленінградскае радыё паведаміла аб тым, што былы лётчык Узбекістана паўтарыў подзвіг беларуса Гастэлы.

Хто такі Шыманскі? Даведкі, якія мне ўдалося навесці ва Узбекістане, вельмі нязначныя. Уладзімір Александравіч Шыманскі — беларус. Кажуць, што некаторы час ён вучыўся ў нашым універсітэце, пасля працаваў журналістам. Вайна застала Шыманскага ў Ташкенце. Ён лётчык грамадзянскай авіяцыі, налятаў тысячы кіламетраў над неабсяжным краем Савецкай Сярэдняй Азіі, пабываў у Іране, Афганістане...

Мне здаецца, што будучыя журналісты зацікавяцца прозвішчам Уладзіміра Аляксандравіча Шыманскага. Бо жыццё і подзвіг гэтага героя варты таго, каб у памяці народа захаваўся вобраз гэтага мужнага лётчыка і журналіста.

М. ІОСЬКА,
аспірант.

Адказ на чайнворд, змешчаны ў мінулым нумары нашай газеты

1. Баку. 2. Урал. 3. Ленінград. 4. Данецк. 5. Кушка. 6. Архангельск. 7. Краснаярск. 8. Кама. 9 Аральскае. 10. Еўпаторыя. 11. Ямал. 12.. Ліпецк. 13. Калінінград. 14 Днепр 15. Раён. 16. Нарва. 17. Арменія. 18. Яна. 19. Абакан. 20. Нарач. 21. Чэхаславакія. 22. Яік. 23. Крым. 24. Мінск. 25. Кызыл. 26. Ладажскае.

В. а. рэдактара П. І. ТКАЧОЎ.

АТ 02017 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.** **Друкарня Выдавецтва «Звязда»** Тыр. 2000. Зак. 717.